# ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА



Мир неинтересен
без стихов и песен.
Кто б из нас заметил,
что в горячке буден
он богат и светел,
а не только труден?
Первыми поэты
доказали это.

Очень хочется, чтобы всем вам было пятерочно во всем, во всем. Если бы можно было всех расцеловать вас. Хоть мысленно целую.

## СУСТРЭЧА З МУЗАЙ РАСІІ

РАДАСНЫЯ, шчырыя усмешкі, моцныя поціскі рук. Звонкія дружныя апладысменты. Сотні маладых гарачых позіркаў... Так віталі пісьменнікаў Расійскай Федэрацыі студэнты універсітэта.

Сярод гасцей, хто прывёз сястры-Беларусі нізкі паклон ад Расіі, паэты і празаікі Масквы, Ленінграда, Варонежа — С. Вікулаў, Д. Кавалёў, Д. Яромін, М. Гарбачоў, Ул. Гардзейчаў, Ул. Аляксееў. Разам з імі і нашы беларускія літаратары І. Шамякін, А. Лойка, І. Навуменка, Ан. Вярцінскі, М. Скрыпка, Ан. Грачанікаў. Майстрам мастацкага слова уручаюцца букеты жывых кветак.

Вечар аб'яўляецца адкрытым. Вядомы беларускі празаік Іван Шамякін прадстаўляе маскоўскага пісьменніка Д. Яроміна.

— Нам, пасланцам рускага народа, — гаворыць ён, — вельмі пашанцавала: мы атрымалі магчымасць выступаць на зямлі слаўнай і гераічнай Беларусі. Мы добра ведаем, што асаблівай зацікаўленасцю да нашай літаратуры вызначаецца моладзь. Вось чаму, выступаючы перад такой цудоўнай аўдыторыяй, наша радасць падвойваецца. І яшчэ больш прыемна адчуваць, што такія вечары цясней збліжаюць нас.

Наша дружба, дружба нашых літаратур народжана рэвалюцыяй, ля калыскі якой стаяў вялікі Ленін. З яго імем звязаны дасягненні ва ўсіх галінах як матэрыяльнага, так і духоўнага жыцця. Геній Леніна натхняе работнікаў літаратуры на няспынныя творчыя пошукі. Напярэдадні юбілею палымянага рэвалюцыянера і вялікага мысліцеля нашай эпохі савецкія пісьменнікі ўсведамляюць, у якім даўгу знаходзяцца яны перад светлай памяццю гэтага чалавека. Пісаць творы, якія праўдзіва раскрываюць веліч і прастату Уладзіміра Ільіча, — што можа быць больш ганаровым і адказным для мастака слова!

Дзмітрый Яромін дзеліцца са студэнтамі сваімі ўспамінамі: яму пашчаслівілася бачыць і чуць Ільіча. Глыбокі след пакінулі ў сэрцы гэтыя сустрэчы. У творчых планах пісьменніка — раскрыць хоць часцінку ленінскай велічы.

Ад зямлі Кальцова пачуццё любві беларускім студэнтам перадае варонежскі паэт Уладзімір Гардзейчаў.

— Мы прыехалі сюды, каб адчуць біццё сэрцаў братняга народа,—гаворыць ён,—каб абмыць свой паэтычны слых гучаннем блізкай мовы.

З вялікім хваляваннем слухаюць прысутныя яго вершы «О родной речи», «Ландыши», «Кукушкины слёзы».

Прачытаць пераклады рускіх твораў на беларускую мову У. Гардзейчаў запрашае Язэпа Семяжона. І вось ужо прыціхшая зала слухае цудоўныя творы Р. Казаковай, Ю. Друнінай, А. Кешокава ў не менш дасканалай інтэрпрэтацыі беларускага паэта і перакладчыка.

Да мікрафона падыходзіць намеснік сакратара Саюза пісьменнікаў СССР па нацыянальнай літаратуры Міхаіл Гарбачоў. Ён расказвае студэнтам аб узаемасувязях братніх літаратур, аб цяжкасцях, якія ўзнікаюць на шляху перакладчыка. Пісьменнік паведамляе, што ў Маскве, як добры падарунак ленінскаму юбілею, выйдзе цэлы шэраг твораў беларускіх паэтаў і празаікаў у перакладзе на рускую мову.

У зале ўсталёўваецца цішыня, калі галоўны рэдактар часопіса «Наш современник» Сяргей Вікулаў успамінае пра трагедыю, якая разыгралася ў вёсцы Хатынь.

— Ніколі не згладзіцца ў памяці народнай гора беларусаў, якія перанеслі крывавыя зверствы фашысцкіх захопнікаў. Кожны чацвёрты жыхар Беларусі загінуў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Мы схіляем галовы перад мужнасцю беларускага народа, волю і дух якога не зламалі ніякія выпрабаванні. У гэтай барацьбе не на жыццё, а на смерць перамагла непарушная дружба народаў Краіны Саветаў.

Цёпла былі сустрэты прысутнымі выступленні Дзмітрыя Кавалёва, Уладзіміра Аляксеева і нашых больш частых гасцей-паэтаў Беларусі Анатоля Вярцінскага, Міхася Скрыпкі, Анатоля Грачанікава.

Увесь гэты час ад студэнтаў паступалі запіскі. І Дзмітрый Яромін разам з Іванам Шамякіным адказваюць на самыя разнастайныя пытанні. Разам з гэтым яны гавораць аб той палітычнай прынцыповасці, аб сур'ёзнай адказнасці, з якімі павінен падыходзіць сапраўдны пісьменнік да вырашэння жыццёва неабходных праблем. Як прыклад Дзмітрый Кавалёў прыводзіць смеласць Маякоўскага, паэта, які «ўсю сваю звонкую сілу паэта» аддаваў партыі і народу, які ніколі не абмінаў вострых пытанняў, а імкнуўся сам іх вырашыць.

У невялікім перапынку перад канцэртам рускіх і беларускіх пісьменнікаў шчыльным колам абступілі няўрымслівыя студэнты: кожнаму хацелася за гэты кароткі час атрымаць аўтограф, пачуць хоць адно слова пісьменнікаў непасрэдна ў шчырай сяброўскай гутарцы...

Як прыемна, што, пачынаючы літаратурныя выступленні ў Беларусі, рускія пісьменнікі ў першы ж вечар завіталі да нашых студэнтаў, а БДУ стаў для іх першым гасцінным домам. Сёння сустрэчы з паэтамі і празаікамі Расійскай Федэрацыі заканчваюцца, і мы ўпэўнены, што на рускую зямлю яны прывязуць цяпло нашых гарачых маладых сэрцаў.

А. СВОРАБ.

*Маім чытачам — студэнтам, выкладчыкам БДУ.*
*Дзякую вам, сябры, за ўвагу да маёй творчасці і да творчасці маіх сяброў — беларускіх пісьменнікаў.*





## РАСІІ

Нялёгкую ты выбрала мне долю—
дала паперу мне, пяро дала...
О, Русь мая, калоссе на падоле,
сінь у вачах і сонца ля чала!
Ты, вечная, юнееш век ад веку!
Табе вялікай праўдай люба жыць.
І пазалоту дзеяў чалавека
ілжой і пудрай фраз не замяніць.
І ты, вялікадушная на дзіва,
дай кару — забыццё, калі ілгу...
І без мяне ты можаш быць шчаслівай—
я без цябе, Расія,—не магу!

**Пераклад Еўдакіі ЛОСЬ.**

# БЕЛАРУСКАЯ ПЕСНЯ Ў КІЕВЕ

На днях з гастрольнай паездкі ў Кіеў вярнуліся ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці. Цёпла прынялі украінскія сябры пасланцоў Беларусі. Канцэрт ва універсітэце імя Т. Р. Шаўчэнкі пачаўся выступленнем харавой капэлы...

Ледзь чутныя акорды павольна набралі сілу. І вось на некалькі хвілін усе забыліся аб тым, што выступае капэла. Цяпер, як наяву, перад кожным стаяў вобраз вялікага песняра украінскага народа Т. Р. Шаўчэнкі. Раптам напружанае крэшчэнда абарвалася, невялікая пауза — і павольнае, лёгкае піяна заключыла твор. «Не забудзьце памянуці добрым, ціхім словам»—нейкае імгненне усё яшчэ гучала ў вушах. Некалькі секунд цішыні — і бурныя апладысменты запоўнілі залу.

«Цяпер усё будзе добра»,—падбадзёрыў усмешкай сваіх харавікоў дырыжор... І сапраўды, на працягу ўсяго канцэрта ў зале гучалі бурныя апладысменты.

Многа цікавых музычных твораў выканалі самадзейныя майстры нашага універсітэта. Па водгуках кіеўскіх студэнтаў, гэта былі хвіліны, калі яны змаглі пабываць на беларускай зямлі і пачуць беларускія народныя песні.

Пасля канцэрта мы доўга не разыходзіліся. З кіеўскімі сябрамі мы гаварылі аб жыцці і дружбе нашых братніх народаў, аб іх мастацтве.

Многа цёплых слоў выказалі кіяўляне ў адрас нашых мастацкіх кіраўнікоў М. А. Лісіцына, дырыжора народнага аркестра народных інструментаў, У. І. Раговіча, кіраўніка народнай харавой капэлы. Усіх вельмі здзівіла тая акалічнасць, што ўжо ў пачатку навучальнага года калектыў дэманструе добрую зладжанасць і ўпэўненасць.

На канцэрце ва універсітэце прысутнічалі маладыя салісткі украінскага народнага хору імя Вяроўкі Ніна Мацвіенка і Валянціна Кавальска. Асабліва падабалася ім тое, што ў рэпертуары многа беларускіх нацыянальных твораў. Па душы прыйшліся ім і салісты аркестра народных інструментаў Ларыса Чапурка і Яўген Сафонаў. Яўген да кіяўлян прывёз свой асабісты падарунак — украінскую песню «Карие очи, черные брови». Як бы ў адказ на гэта, Ніна і Валя падаравалі нам некалькі беларускіх песень у сваім выкананні. Мы запісалі іх на плёнку.

Вечар падыходзіў к канцу, калі нехта з нашых студэнтаў прапанаваў усім удзельнікам канцэрта пайсці да помніка кабзару і развітацца з ім. Зноў, цяпер ужо пад адкрытым небам ля магутнага манумента вялікаму Т. Р. Шаўчэнку, прагучалі акорды «Запавіту» і старыннага студэнцкага гімна «Гаудэамус».

Можна сказаць, што выступленні калектыву мастацкай самадзейнасці у Кіеве выліліся ў своеасаблівы фестываль беларускай народнай песні. За час знаходжання на украінскай зямлі мы далі пяць канцэртаў. Былі гасцямі ў курсантаў КВІРТУ, у працаўнікоў сяла. Акрамя выступленняў, мы пазнаёміліся з горадам, з яго гістарычнымі помнікамі.

Я. СКВАРЧЭЎСКІ,
В. ЛІТВІНКА.

Рэдактар А. НІКОЛЕНКА.

АТ 18978 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т-22-07-19. Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Тыраж 2000 экз. Зак. 1611.